# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

**ВУЧЭННЕ — ТОЛЬКІ СВЯТЛО, ПА НАРОДНАЙ ПРЫМАЎЦЫ, — ЯНО ТАКСАМА І СВАБОДА. НІШТО ТАК НЕ ВЫЗВАЛЯЕ ЧАЛАВЕКА, ЯК ВЕДЫ… *І. ТУРГЕНЕЎ***



## ТЭМАТЫЧНЫ ДЗІЦЯЧЫ ПРАЕКТ “ЧАМУ АРМІЯ РОДНАЯ?”

## СВЯТОЧНЫ ПРЫЁМ ВУЧНЯЎ 1 і 2 КЛАСАЎ У РАДЫ АКЦЯБРАТ



На грудзях малодшых школьнікаў заззяў акцябрацкі значок – сімвал прыналежнасці да грамадскага аб’яднання “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя”.




**Мова** — гэта наша спадчына, гісторыя. Мова дае нам цудоўную магчымасць радавацца і смяяцца, выказваць свае думкі і пачуцці.

## АФГАНІСТАН У ЛЁСАХ НАШЫХ ЗЕМЛЯКОЎ

Афганская вайна - першая буйная антытэрарыстычная вайна найноўшай гісторыі, якая наглядна прадэманстравала высокія маральна-баявыя якасці савецкіх воінаў.

*Хопіць боек,*
*пара супыніцца,*
*Міру – «Так!»,*
*войнам жудасным – «Не!»*
*Свету годнасцю лепш ганарыцца,*
*Калі скажа: «Ужо досыць!» вайне.*




*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*

| | | |
|---|---|---|
| ПРЫЁМ У РАДЫ ГА БРПА “АКЦЯБРАТЫ” | НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА | ТЫДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ |

## ВУЧНІ 1 І 2 КЛАСАЎ БЫЛІ ПРЫНЯТЫ Ў РАДЫ ГА БРПА “АКЦЯБРАТЫ”. АКЦЯБРАТЫ – ГЭТА БУДУЧЫНЯ НАШАЙ КРАІНЫ, І МЫ ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ ІМ СТАЦЬ ДОБРЫМІ ЛЮДЗЬМІ

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ, 8 КЛАС**

**“Акцябраты” - гэта дружная група рабят, аб'яднаных агульнай дзейнасцю.**

Яны актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці школы і раёна. Рабяты дапамагаюць старэйшым у выкананні розных спраў, такіх як уборка тэрыторыі, пасадка дрэў і кветак, а таксама ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах і святах.



У рамках акцябрацкай дзейнасці праводзяцца розныя гульні, конкурсы, экскурсіі і сустрэчы з цікавымі людзьмі. Акрамя таго, акцябраты вывучаюць правілы паводзін і асновы піянерскай маралі, знаёмяцца з гісторыяй сваёй краіны і традыцыямі.



Для акцябрат таксама арганізуюцца спецыяльныя акцябрацкія лінейкі і сходы, на якіх яны прымаюць на сябе абавязкі па выкананні розных заданняў і спраў.

Такім чынам, акцябраты з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі грамадскага жыцця, вучацца працаваць у камандзе і паважаць старэйшых.



## *Акцябраты – будучыя піянеры*

**Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню памяці юных герояў-антыфашыстаў, на якой вучні 1 і 2 класаў былі прыняты ў рады акцябрат.**



Акцябраты вымавілі клятву і паабяцалі быць сумленнымі, дружнымі, клапаціцца пра блізкіх, адказваць за даручаную справу. І нарэшце на грудзях заззяў акцябрацкі значок – сімвал прыналежнасці да грамадскага аб’яднання “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя”.





# АФГАНІСТАН



Афганская вайна доўжылася з 25 снежня 1979 года па 15 лютага 1989 года – 9 гадоў 1 месяц 21 дзень. Гэта была першая буйная антытэрарыстычная вайна найноўшай гісторыі, якая наглядна прадэманстравала высокія маральна-баявыя якасці савецкіх воінаў.

Юрый Анатольевіч Палуміскаў – настаўнік гісторыі, кіраўнік ваенна - патрыятычнага выхавання – у сваім мінулым вялікі перыяд часу прысвяціў ваеннай службе. У яго памяці засталіся людзі, якія былі ўдзельнікамі той крывавай бітвы. Юрый Анатольевіч падзяліўся з навучэнцамі гісторыямі сваіх таварышаў, распавёў пра гераізм савецкіх салдат на тэрыторыі Афганістана.



## У кожнага часу свае героі

### ГЕРМАНОВІЧ КСЕНІЯ

### 8 КЛАС

**Рэспубліканская дэкада грамадзянска-патрыятычных спраў «Афганістан у лёсах нашых землякоў».**

У 2024 годзе спаўняецца 35 гадоў з дня вываду савецкіх войск з Афганістана. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 1998 г. № 157 «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь» 15 лютага ўстаноўлена Днём памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.






**21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Дзень роднай мовы. Ён асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яе носьбіта.**

Менавіта гэтаму святу з 19 па 23 лютага ў нашай установе адукацыі прымеркаваны Тыдзень роднай мовы.

Вучняў чакалі разнатыпныя гульні, музычныя перапынкі, цікавыя фізкультхвілінкі. Давайце бліжэй пазнаёмімся са старонкамі свята.

***Інфармацыйная гадзіна "Збяры Беларусь у сваім сэрцы"***

Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.

Менавіта з такіх прыгожых слоў і пачалася інфармацыйная гадзіна, прысвечаная тыдню роднай мовы.

Падчас мерапрыемства вучні дазналіся пра гісторыю свята, пагулялі ў загадкі і метаграмы, адказалі на пытанні па народных святах беларусаў, а таксама паслухалі спевы птушак і спрабавалі іх пазнаць.

***Кніжная выстава "Пісьменнікі-юбіляры"***

У 2024 годзе культурная грамадскасць Беларусі адзначае юбілеі цэлай плеяды беларускіх пісьменнькаў: Васіль Быкаў (100 год), Аляксей Якімовіч (120 год), Артур Вольскі (100 год), Іван Чыгрынаў (90 год), Міхась Лынькоў (125 год), Максім Лужанін (115 год), Аркадзь Куляшоў (110 год) і многія іншыя.

Кожны з дзяцей мог пазнаёміцца з выставай і, вядома ж, узяць пачытаць любы з твораў-юбіляраў. Гэтак жа яны здзейснілі невялікае літаратурнае падарожжа ў свет цікавых і такіх розных кніг.







## ТЭМАТЫЧНЫ ДЗІЦЯЧЫ ПРАЕКТ “ЧАМУ АРМІЯ РОДНАЯ?”

## Марафон грамадзянска-патрыятычных акцый “Мы ведаем! Мы памятаем! Мы ганарымся!”

**САВЕНОК ГАННА, 8 КЛАС**

*Колькі песен намі спета!*
*Не забыць ніколі гэта.*
*Сталі разам мы ў адзін*
*армейскі строй.*
*Разам жылі і служілі,*
*Сябравалі – не тужілі,*
*Ну, а песня падымала нам настрой!*

# НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

У рамках абласнога марафону грамадзянска-патрыятычных акцый “Мы ведаем! Мы памятаем! Мы ганарымся!”, прымеркаванага да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, у нашай установе адукацыі быў рэалізаваны тэматычны дзіцячы праект “Чаму армія родная?”



У ходзе гэтага праекта рабяты ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах. Дзякуючы ім яны даведаліся, што такое армія і чаму яна для ўсіх родная. Намалявалі свае любімыя ваенныя прафесіі, прынялі ўдзел у гульнях на ваенную тэматыку, зрабілі падарункі для тат і дзядоў.

Таксама яны наведалі школьны музей, паглядзелі тэматычныя прэзентацыі, пазнаёміліся са скульптурна - архітэктурнымі будынкамі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне, сустрэліся з сапраўдным вайскоўцам і арганізавалі фотавыставу “Мой тата таксама быў салдатам”.





ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

## ВЫВУЧЫЦЕ З



## ВЫРАТАВАННЯ ПРЫ



1. Не панікуй
2. Нідзе не хавайся
3. Выбягай з памяшкання
4. Паведамі дарослым
5. Патэлефануй на 112



Глядзіце серыі мультфільмаў МНС «Чароўная кніга» і «Спецатрад 112». Героі мультфільмаў раскажуць дзецям правілы бяспекі дома, на вуліцы і інш.

